# **ДАВЕДКІ** (10 клас)

<table>
<tr><th>Заданні</th><th>Магчымыя варыянты адказаў</th><th>Крытэрыі ацэнкі</th></tr>
<tr><td>1. Праілюструйце назвамі беларускіх гарадоў наступныя фанетычныя з’явы (па адным прыкладзе на кожны выпадак):<br>1. Аглушэнне звонкіх зычных на канцы слова.<br>2. Асіміляцыя па глухасці (прыпадабненне звонкіх зычных да глухіх).<br>3. Асіміляцыя па мяккасці (прыпадабненне цвёрдых зычных да мяккіх).<br>4. Фанетычнае падаўжэнне зычных.<br>5. Узнікненне прыстаўных (устаўных) зычных гукаў.</td><td>1. Нясвіж.<br>2. Стоўбцы.<br>3. Касцюковічы.<br>4. Краснаполле.<br>5. Чавусы.<br>NB: розніцу паміж горадам і пасёлкам гарадскога тыпу можна ігнараваць.</td><td>5 б.<br>1 б. за ілюстрацыю кожнага выпадку</td></tr>
<tr><td>2. Пададзеныя назоўнікі запішыце ў форме назоўнага склону множнага ліку, а таксама спалучыце іх з лічэбнікамі два, тры, чатыры. Аформіце адказ у выглядзе табліцы:
<table>
<tr><td>Назоўнік (у пачатковай форме)</td><td>У форме назоўнага склону множнага ліку</td><td>У спалучэнні з лічэбнікамі два (дзве), тры, чатыры</td></tr>
<tr><td>Мароз</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Рабро</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Вядро</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Акно</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>Вуха</td><td></td><td></td></tr>
</table></td><td>2.
<table>
<tr><td>Назоўнік (у пачатковай форме)</td><td>У форме назоўнага склону множнага ліку</td><td>У спалучэнні з лічэбнікамі два), тры, чатыры</td></tr>
<tr><td>Мароз</td><td>Маразы</td><td>Марозы</td></tr>
<tr><td>Рабро</td><td>Рэбры</td><td>Рабры</td></tr>
<tr><td>Вядро</td><td>Вёдры</td><td>Вядры</td></tr>
<tr><td>Акно</td><td>Вокны</td><td>Акны</td></tr>
<tr><td>Вуха</td><td>Вушы</td><td>Вухі</td></tr>
</table></td><td>5б. (0,5*10)<br>Па 0,5б. за кожную правільную форму</td></tr>
<tr><td>3. Правільна запішыце прыслоўі і прыслоўныя спалучэнні<br>(Да)хаты, (дэ)факта, (з)вечара, (з)налёту, куды(сь), (па)праўдзе, (па)пластунску, (па)чэсна, (на)прапалую, (у)адкрытую, (што)дня, (у)прыкуску.</td><td>3.<br>Дахаты, дэ–факта, звечара, з налёту, кудысь, папраўдзе, па–пластунску, пачэсна, напрапалую, у адкрытую, штодня, упрыкуску.</td><td>6 б.<br>0,5 б. за кожнае слова</td></tr>
<tr><td>4. Дадзены пары фразеалагізмаў. У дужках за кожнай парай знаходзіцца лексічнае значэнне аднаго з іх. Прывядзіце лексічнае значэнне другога фразеалагізма ў кожнай пары.<br>1. Біць у вочы / біць у нос (‘рэзка выдзяляцца, прыцягваць увагу’).<br>2. Біць у званы / біць у літаўры (‘празмерна хваліцца чым-небудзь’).<br>3. Браць у палон / браць за горла (‘сілай прымушаць да чаго-небудзь’).<br>4. Даць цягу / даць чапаласу (‘моцна сварыцца на каго-небудзь; караць каго-небудзь’).<br>5. Ісці ва-банк / ісці на свой хлеб (‘дзейнічаць, рызыкуючы ўсім, што ёсць’).</td><td>4.<br>1. Біць у нос – ‘востра, рэзка пахнуць, выклікаючы адмоўную рэакцыю’.<br>2. Біць у званы – ‘настойліва звяртаць увагу на небяспеку’.<br>3. Браць у палон – ‘прываблiваючы, падпарадкоўваць свайму ўплыву, зачароўваць’.<br>4. Даць цягу – ‘кінуцца наўцёкі’.<br>5. Ісці на свой хлеб – ‘пачынаць жыць самастойна, зарабляючы на сябе’</td><td>7,5 б.<br>0,5 б. за правільна выбраны фразеалагізм, 1 б. за правільнае лексічнае значэнне.</td></tr>
<tr><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

| | | |
|---|---|---|
| **5. Прачытайце ўрывак з верша “Вясёлая граматыка” *Рыгора Барадуліна*.**<br>*Непаслухмяных словаў*<br>*Варта –*<br>*Сем склонаў.*<br>*Іх запомніць варта!*<br>**Абазначце граматычныя асновы ў абодвух сказах. Вызначце від выказніка ў кожным сказе.**<br>**Пра які сёмы склон гаворыць народны паэт Беларусі? Запішыце імя аўтара ў форме гэтага склону.** | 5.<br>*Непаслухмяных словаў*<br>*Варта –*<br>*Сем склонаў*. (выказнік *варта (ёсць)* – састаўны іменны).<br>*Іх запомніць варта!* - выказнік *запомніць варта* – састаўны дзеяслоўны)<br><br>Паэт гаворыць пра клічны склон (клічную форму), які служыць для называння асобы, да якой звяртаемся. *Рыгору*! – клічная форма імені Барадуліна. | **7 б.**<br>2 б. за вызначэнне асноў; 2 б. за вызначэнне віду выказнікаў;<br>2 б. за клічны склон; 1 б. за форму *Рыгору*! |
| **6. У беларусаў было прынята іменаваць членаў сям’і па прозвішчы ці імені главы сям’і-мужчыны. У падкрэсленых уласных назвах з лістоў беларускіх пісьменнікаў абазначце суфіксы. Вызначце значэнне кожнага суфікса.**<br>*1. Купала і Купаліха асталіся даўжэй* (Я. Колас)<br><br>*2.. Прывітанне і нізкі паклон Ірыне Міхалішцы* (Р. Барадулін)<br><br>3. *Дарагі паночку! Можа, аддавец гэтага панна Вера Краўцэвічанка будзе шукаць сабе працы, то будзьце ласкавы не адкажыце ёй у сваёй магчымай у гэтым падмозе-пратэкцыі* (Я. Купала) | 6.<br><br>*1. Купал–іх–а*. Пры дапамозе суфікса –іх– утвараецца назва асобы жаночага полу па мужу: Купаліха – жонка Купалы.<br>2. *Міхал–ішц–ы*. Пры дапамозе суфікса –ішк– утвараецца назва асобы жаночага полу па бацьку: Міхалішка – дачка Міхала.<br>3. *Краўцэвіч-анк-а*. Пры дапамозе суфікса –анк– утвараецца назва асобы жаночага полу па бацьку: Краўцэвічанка – дачка Краўцэвіча. | **4,5 б.**<br>1,5 б. (0,5*3) за выдзяленне суфіксаў; 3б. (1*3) за тлумачэнне значэння |
| 7. **Перад Вамі запісаны ў форме празаічнага тэксту фрагмент вершаванага твора *Максіма Танка*. Расстаўляючы патрэбныя знакі прыпынку, запішыце яго ў форме верша, не забываючыся аб тым, што кожны радок верша пачынаецца з вялікай літары.**<br>*Яно маўчыць яно не можа і сотай долі перадаць як выглядаеш ты прыгожа як вочы зорамі гараць. Ты лепш пакліч мяне красуня хоць на хвілінку да сябе і мне не будзе гэтак сумна і я дапамагу табе прымераць стужкі завушнічкі і плечы хусткай ахінуць і лакавыя чаравічкі перад “Лявоніхай” абуць.*<br><br>**Выпішыце з верша ўсе рады аднародных членаў. Не забудзьце ўказаць, якімі членамі сказа яны з’яўляюцца.** | 7.<br>*Яно маўчыць, яно не можа*<br>*І сотай долі перадаць,*<br>*Як выглядаеш ты прыгожа,*<br>*Як вочы зорамі гараць.*<br><br>*Ты лепш пакліч мяне, красуня,*<br>*Хоць на хвілінку да сябе,*<br>*І мне не будзе гэтак сумна,*<br>*І я дапамагу табе*<br><br>*Прымераць стужкі, завушнічкі,*<br>*І плечы хусткай ахінуць,*<br>*І лакавыя чаравічкі*<br>*Перад “Лявоніхай” абуць.*<br><br>*Стужкі, завушнічкі* – аднародныя дапаўненні;<br>*прымераць, ахінуць, абуць* – аднародныя дапаўненні. | **9 б.**<br>2 б. за правільна запісаны верш (-0,5 за кожную памылку);<br>3 б. за правільную пунктуацыю (-0,5 за кожную памылку);<br>2 б. за кожны правільна выпісаны рад аднародных і вызначэнне сінтаксічнай функцыі |

| | | |
|---|---|---|
| | | |
| **8. Пра якія творы беларускай літаратуры гаворыць літаратуразнаўца *Пятро Васючэнка*? Назавіце аўтара кожнага твора.**<br>*1. Твор-загадка, значнасць якога таксама вымяраецца яго жывучасцю ў XXI стагоддзі. Сюжэтныя вытокі п'есы шэкспіраўскія. Гэта гісторыя пра палескіх Рамэа і Джульету.*<br>*2. Легендарны час – гэта вельмі-вельмі даўно. У тыя часы кахаў, пакутаваў ад здрады і помсціўся ўсяму свету Машэка, герой паданняў і паэмы ______________.*<br>*3. Мастацкі час можа быць рытмічны і арытмічны. Час, які вяртаецца да свайго пачатку, утварае кола або цыкл. Адлюстраваны ў творы гадавы цыкл спарадзіў летапіс, хроніку, раман-год, паэму-год. _____________ – узор паэмы-года.* | 8.<br>*1. "Пінская шляхта"; Вінцэнт Дунін–Марцінкевіч.*<br>*2. "Магіла льва"; Янка Купала.*<br>*3. "Новая зямля"; Якуб Колас.* | **6 б.**<br>3 б. (1*3) за творы; 3 б. (1*3) за аўтараў |
| | **УСЯГО** | **50 б.** |

Пры праверцы заданняў варта ўлічваць арфаграфічныя, граматычныя і іншыя памылкі. За кожную з іх рэкамендуецца здымаць 0,1 бала ў тых заданнях, якія ацэнены станоўчым балам.